Зацверджаны на пасяджэнні кафедры
26.12.2023 г., пратакол № 6

# КРЫТЭРЫ АЦЭНКІ ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ НАВУЧАЮЧЫХ У УСТАНОВАХ ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ ПА ДЗЕСЯЦІБАЛЬНАЙ ШКАЛЕ ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ «ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ»

**10 (дзесяць) балаў, залічана:**

сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па такіх раздзелах вучэбнай праграмы, як “Асноўныя этапы развіцця беларускай дзяржаўнасці”, “Асновы дзяржаўнага ладу Рэспублікі Беларусь”, “Беларусь на скрыжаванні культур і цывілізацый”, а таксама па асноўных пытаннях, якія выходзяць за яе межы;

дакладнае выкарыстанне гістарычнай, паліталагічнай і культуралагічна-ідэалагічнай тэрміналогіі, пісьмовы або вусны лагічна правільны выклад адказу на пытанні аб асноўных гістарычных этапах фарміравання дзяржаўнасці, нацыянальнай дзяржаўнасці і асновах канстытуцыйнага ладу Рэспублікі Беларусь, уменне рабіць абгрунтаваныя высновы і абагульнення;

бездакорнае валоданне навуковым інструментарыем дысцыпліны “Гісторыя беларускай дзяржаўнасці”, веданне метадалагічных асноў і перыядызацыі гісторыі беларускай дзяржаўнасці;

беспамылковае выкарыстанне ключавых катэгорый, звязаных з гісторыяй і дзяржаўным будаўніцтвам Рэспублікі Беларусь;

выдатна засвоеныя навыкі гісторыка-рэтраспектыўнай і сучаснай характарыстыкі культурна-цывілізацыйнага развіцця Беларусі, этапаў фарміравання беларускай нацыі і канстытуцыйнага ладу Рэспублікі Беларусь;

поўнае і глыбокае засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры па дысцыпліне “Гісторыя беларускай дзяржаўнасці”;

уменне свабодна арыентавацца ў тэорыях, канцэпцыях і накірунках па дысцыпліне “Гісторыя беларускай дзяржаўнасці” і даваць ім аналітычную ацэнку, выкарыстоўваць навуковыя дасягненні гісторыі, гісторыі права, паліталогіі, культуралогіі, ідэалогіі ;

творчая самастойная работа на семінарскіх занятках, актыўны ўдзел у групавых абмеркаваннях пытанняў звязаных з прычынамі і следствам пэўных гістарычных падзей і палітычных працэсаў, высокі ўзровень культуры выканання заданняў і маўлення;

валоданне аналітычнымі навыкамі пры параўнанні гістарычных школ і гістарыяграфічных падыходаў, уменне вылучыць галоўнае і значнае ў сфармуляваных тэорыях і канцэпцыях.

**9 (дзевяць) балаў, залічана:**

сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па такіх раздзелах вучэбнай праграмы, як “Асноуныя этапы развіцця беларускай дзяржаунасці”, “Асновы

дзяржаўнага ладу Рэспублікі Беларусь”, “Беларусь на скрыжаванні культур і цывілізацый”;

дакладнае выкарыстанне навуковай тэрміналогіі (уключаючы на замежнай мове), пісьменнае пісьмовае або вуснае, лагічна правільнае выкладанне адказу на пытанні аб этапах развіцця беларускай дзяржаунасці, асновах канстытуцыйнага ладу Рэспублікі Беларусь;

валоданне інструментарыем навучальнай дысцыпліны “Гісторыя беларускай дзяржаўнасці” і ўменне фармуляваць і аргументаваць асноўныя ідэі і падыходы беларускай мадэлі развіцця;

добра засвоеныя навыкі гісторыка-рэтраспектыўнай характарыстыкі культурна-цывілізацыйнага развіцця Беларусі, этапаў фарміравання беларускай нацыі і канстытуцыйнага ладу Рэспублікі Беларусь;

здольнасць самастойна і творча вырашаць складаныя праблемы ў нестандартнай сітуацыі ў межах вучэбнай праграмы па навучальнай дысцыпліне “Гісторыя беларускай дзяржаўнасці”;

поўнае засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры па гісторыі Беларусі, гісторыі дзяржавы і права Беларусі, этнічнай і канфесійнай гісторыі Беларусі;

уменне арыентавацца ў тэорыях, канцэпцыях і накірунках па дысцыпліне “Гісторыя беларускай дзяржаўнасці” і даваць ім аналітычную ацэнку, выкарыстоўваць навуковыя дасягненні гісторыі, гісторыі права, паліталогіі, культуралогіі, ідэалогіі ;

сістэматычная, актыўная самастойная работа на семінарскіх занятках, творчы ўдзел у групавых абмеркаваннях пытанняў звязаных з асаблівасцямі зараджэння і развіцця беларускай дзяржаўнасці, высокі ўзровень культуры выканання заданняў і маўлення;

валоданне навукова-тэарытычнымі і метадалагічнымі ведамі па гісторыі Беларусі.

**8 (восем) балаў, залічана:**

сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы як: “Асноуныя этапы развіцця беларускай дзяржаунасці”, “Асновы дзяржаўнага ладу Рэспублікі Беларусь”, “Беларусь на скрыжаванні культур і цывілізацый” па вучэбнай дысцыпліне «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці»;

выкарыстанне навуковай тэрміналогіі (уключаючы на замежнай мове), пісьмовае або вуснае, лагічна правільнае выкладанне адказу на пытанні аб этапах развіцця беларускай дзяржаунасці, асновах канстытуцыйнага ладу Рэспублікі Беларусь, умение рабіць абгрунтаваныя высновы і абагульнні па значным гістарычным падзеям;

валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці» (метадамі комплекснага аналізу, тэхнікай інфармацыйных тэхналогій), уменне яго выкарыстоўваць у пастаноўцы і вырашэнні навуковых і прафесійных задач;

засвоенне навыку гісторыка-рэтраспектыунай характарыстыкі культурна-цывілізацыйнага развіцця Беларусі, этапау фарміравання беларускай нацыі і канстытуцыйнага ладу Рэспублікі Беларусь;

здольнасць самастойна вырашаць складаныя праблемы ў рамках вучэбнай праграмы па вучэбнай дысцыпліне;

засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай;

уменне арыентавацца ў тэорыях, канцэпцыях і кірунках па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне і даваць ім аналітычную ацэнку;

актыўная самастойная праца на семінарскіх занятках, сістэматычны ўдзел у групавых абмеркаваннях звязаных з развіццём беларускай дзяржаунасці, высокі ўзровень культуры выканання заданняў.

**7 (сем) балаў, залічана:**

сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па наступных раздзелах вучэбнай праграмы: "Асноуныя этапы развпцця беларускай дзяржаунасці", "Асновы дзяржаунага ладу Рэспублікі Беларусь", "Беларусь на скрыжаванні

культур і цывілізацый";

выкарыстанне навуковай тэрміналогіі (уключаючы на замежнай мове), пісьмовы або вусны, лагічна правільны выклад адказ на пытанні аб асноуных атапах развіцця беларускай дзяржаунасці, уменне рабіць абгрунтаваныя высновы і абагульненні на падставе гістарычных ведаў;

валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці», уменне яго выкарыстоўваць у гісторыка-рэтраспектыўнай характарыстыкі культурна-цывілізацыйнага развіцця Беларусі;

свабоднае валоданне апорнымі датамі ў рамках вучэбнай дысцыпліны;

засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай;

уменне арыентавацца ў асноўных гістарычных тэорыях, канцэпцыях,

напрамках па вучэбнай дысцыпліне «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці» і даваць ім аналітычную ацэнку;

самастойная праца на семінарскіх занятках, удзел у групавых абмеркаваннях пытанняў па гісторыі Беларусі, высокі ўзровень культуры выканання заданняў.

**6 (шэсць) балаў, залічана:**

дастаткова поўныя і сістэматызаваныя веды ў аб'ёме вучэбнай праграмы па вучэбнай дысцыпліне «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці»;

выкарыстанне неабходнай навуковай гістарычнай тэрміналогіі, пісьмовы або вусны, лагічна правільны выклад адказу на пытанні аб перыядызацыі пстрыі беларускай дзяржаунасці, этапах фарміравання нацыі, уменне рабіцьабагульненне і абгрунтаваныя высновы на падставе гістарычных ведау;

валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, модуля, уменне

яго выкарыстоўваць у вырашэнні навучальных і прафесійных задач, ведаць асноуныя даты;

здольнасць самастойна ўжываць тыпавыя рашэнні ў рамках вучэбнай праграмы па вучэбнай дысцыпліне «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці»;

засваенне асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай па вучэбнай дысцыпліне;

уменне арыентавацца ў базавых гістарычных тэорыях, канцэпцыях і напрамках па вывучаемай дысцыпліне, модулю і даваць ім параўнальную ацэнку;

актыўная самастойная праца на семінарскіх занятках, перыядычны ўдзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання заданняў.

**5 (пяць) балаў, залічана:**

дастатковыя веды ў аб'ёме вучэбнай праграмы ува па вучэбнай дысцыпліне «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці»;

выкарыстанне навукова-гістарычнай тэрміналогіі, пісьменны або вусны, лагічна правільны выклад адказу на пытанні, уменне рабіць высновы;

валоданне інструментарыем гістарычнай дысцыпліны, веданне апорных дат па гісторыі беларускай дзяржаунасці, уменне яго выкарыстоўваць у вырашэнні навучальных і прафесійных задач;

здольнасць самастойна прымяняць тыпавыя рашэнні ў рамках вучэбнай праграмы па вучэбнай дысцыпліне «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці»;

засваенне асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай у па вучэбнай дысцыпліне «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці»;

уменне арыентавацца ў базавых тэорыях, канцэпцыях і напрамках па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне і даваць ім параўнальную ацэнку;

самастойная праца на семінарскіх занятках, фрагментарны ўдзел у групавых абмеркаваннях, дастатковы узровень культуры выканання заданняў.

**4 (чатыры) балы, залічана:**

дастатковы аб'ём ведаў у аб'ёме вучэбнай праграмы адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі;

засваенне асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай ува па вучэбнай дысцыпліне «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці»;

выкарыстанне навукова- гістарычнай тэрміналогіі, лагічны выклад адказу на пытанні, уменне рабіць высновы без істотных памылак;

валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, модуля, уменне яго выкарыстоўваць у вырашэнні стандартных (тыпавых) задач, веданне некаторых дат;

уменне пад кіраўніцтвам выкладчыка вырашаць стандартныя (тыпавыя) задачы;

уменне арыентавацца ў асноўных тэорыях, канцэпцыяхь і напрамках па вывучаемай вучэбнай дысцыплінеі даваць ім ацэнку;

праца пад кіраўніцтвам выкладчыка на семінарскіх занятках, дапушчальны ўзровень культуры выканання заданняў

**3 (тры) балы, не залічана:**

недастаткова поўны аб'ём ведаў у аб'ёме вучэбнай праграмы адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці»;

веданне часткі асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай па вучэбнай дысцыпліне «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці»;

выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, пераказ адказу на пытанні з істотнымі, лагічнымі памылкамі;

слабое валоданне інструментарыем гістарычнай дысцыпліны, некампетэнтнасць ў вырашэнні стандартных (тыпавых) задач;

няўменне арыентавацца ў асноўных тэорыях, канцэпцыях

і напрамках вывучаемай вучэбнай дысцыпліны, неведанне асноўных дат;

пасіўнасць на практычных і лабараторных занятках, нізкі узровень культуры выканання заданняў.

**2 (два) балы, не залічана:**

фрагментарныя веды ў аб'ёме вучэбнай праграмы па вучэбнай дысцыпліне «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці»;

веды асобных літаратурных крыніц, рэкамендаваных вучэбнай праграмай па вучэбнай дысцыпліне «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці»;

няўменне выкарыстоўваць навукова-гістарычную тэрміналогію вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці»;

наяўнасць у адказе грубых, лагічных памылак;

пасіўнасць на семінарскіх занятках, нізкі узровень культуры выканання заданняў.

**1 (адзін) бал, не залічана:**

адсутнасць ведаў і кампетэнцый ў аб'ёме вучэбнай праграмы адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці»;

адмова ад адказу;

няяўка на атэстацыю без уважлівай прычыны.

Заведуючы кафедрай
філасофіі і паліталогіі В.Л.Пазнякова